Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ПАГОДЫ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае
Кіраўніцтва АГМС БССР

№ 17 (197) | 11—20 чэрвеня | 1935 г.

ЗМЕСТ

Агляд надвор'я за дэкаду

Надвор'е гэтай дэкады можна падзяліць на два рэзкіх перыяда: у першы перыяд з 11-га па 16-ае чэрвеня ўключна, мы мелі пераважна сухое і цёплае надвор'е з ясным небам і вялікім сутачным ходам тэмпературы. Гэта тлумачыцца тым, што на тэрыторыі БССР знаходзіліся пераважна сухія масы, кантынентальна-палярнага паветра і толькі на кароткі тэрмін 13-га чэрвеня ўваходзіць маса вільготнага марскога палярнага паветра і ў гэты дзень мы назіралі значную воблачнасць і невялікія праходзячыя дажджы. Другі перыяд характарызаваўся цёплым і гарачым надвор'ем са значнай воблачнасцю, дажджамі, навальніцамі і ліўнямі, а таксама мясцамі назіралася выпадзенне граду. У гэтыя дні мы мелі рэзкія змены розных паветраных мас; 17-га чэрвеня на тэрыторыю БССР уваходзіць маса ранейшага марскога палярнага паветра. У далейшыя дні 18-га і 19-га чэрвеня, гэтая маса ператвараецца ў кантынентальна-палярнае, а 20-га чэрвеня на змену гэтай масе зноў уваходзіць вільготная маса марскога палярнага паветра. Такім чынам гэтая дэкада характэрна цёплым надвор'ем з праходзячымі дажджамі і навальніцамі.

Табліца вынікаў метэаралагічных назіранняў за 11—20 чэрвеня 1935 г.

Назва станцый	Тэмпература паветра																Адносная вільготн. паветра ва 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны чыслы)
	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі нагляд. мінімум		Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сума	
Дрыса	14	17	14	18	21	22	18	20	15	18	—	18	—	28	5	11	54	—	5	11	..	4.0	0.6	..	..	5.0	6.0	4.0	0.1	2.0	—	21.7	граза (17, 18, 20)
Полацк	13	17	14	18	21	23	19	21	15	16	—	18	16	28	6	11	53	—	—	—	..	6.0	..	..	..	8.0	1.0	11.0	1.0	27.0	—	54.0	граз. (18, 20) гр. (20) т. (18)
Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Нова-Каралёва	12	16	13	16	19	21	21	22	16	20	—	18	16	28	5	11	55	41	2	11	..	7.0	..	..	..	0.5	2.0	0.2	0.3	13.0	—	23.0	граза (20)
Лепель	13	17	15	18	21	22	20	21	15	18	—	18	—	29	7	11	52	—	6	11	..	7.0	0.1	..	..	5.0	0.1	3.0	0.1	..	—	15.3	граза (17, 18, 20)
Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Барысаў	14	18	16	19	21	23	21	21	16	19	—	19	17	30	8	11	49	—	6	12	..	10.0	..	..	..	4.0	..	23.0	..	14.0	—	51.0	г.(18,20)т.(14,15,16,20)л.(18)
Менск	14	18	15	18	20	22	20	21	16	17	—	18	17	27	7	11	58	—	—	—	..	3.0	..	..	..	11.0	0.1	0.1	1.0	7.0	—	22.2	лівень (16, 20)
Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Мар'іна-Горка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Асіпавічы	16	19	16	19	22	24	22	22	18	21	—	20	17	32	7	11	44	—	—	—	..	6.0	..	..	..	21.0	..	3.0	..	2.0	—	32.0	граза (18)
Орша	13	15	14	16	20	22	22	23	18	20	—	18	17	29	7	11	—	—	4	12	..	3.0	..	..	..	..	2.0	0.1	8.0	24.0	—	37.1	граза, лівень (20)
Горкі	14	15	14	17	20	21	22	23	18	19	—	18	17	28	7	12	52	53	6	12	..	2.0	1.0	..	..	..	0.1	1.0	7.0	12.0	—	23.1	граза (12, 20)
Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Слуцк	16	20	15	18	21	22	21	21	17	17	—	19	—	28	7	11	59	—	7	11	..	9.0	..	..	..	35.0	1.0	2.0	9.0	17.0	—	64.0	граза (17, 20)
Мар.-Сосны	15	20	15	18	21	23	20	23	19	17	—	19	18	29	3	11	50	—	—	—	..	9.0	..	..	..	5.0	..	..	8.0	13.0	—	35.0	туман (14, 20)
Магілеў	14	16	15	18	22	22	23	23	19	18	—	19	17	30	7	12	54	—	—	—	..	4.0	..	..	..	..	..	0.5	..	15.0	—	19.5	граза (13, 20)
Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Чэрыкаў	14	16	14	17	20	22	23	24	19	19	—	19	17	30	7	12	48	—	—	—	..	0.1	1.0	..	..	..	..	..	5.0	6.0	—	12.1	граза (18, 19, 20)
Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Турск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Жлобін	15	18	18	18	20	22	23	23	20	20	—	20	17	29	9	11	43	—	—	—	..	4.0	..	..	..	..	..	0.4	11.0	10.0	—	25.4	граза (17, 18, 19, 20)
Жыткавічы	16	20	16	18	22	23	22	23	19	19	—	20	18	28	7	11	48	—	—	—	..	11.0	..	..	..	7.0	1.0	0.5	0.3	..	—	19.8	граза (13)
Калінкавічы	16	19	16	18	21	22	23	22	21	19	—	20	18	30	7	11	47	—	—	—	..	4.0	..	..	..	..	..	6.0	..	2.0	—	12.0	лівень (18); граза (20)
Лельчыцы	18	21	16	18	21	24	23	23	20	17	—	20	—	30	—	—	48	—	—	—	..	4.0	..	..	..	1,0	..	2.0	—	—	—	—	граза (16, 18, 20)
Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	..	3.0	..	..	..	..	..	..	12.0	0.1	—	15.1	граза з градам (19)
Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Гомель	15	17	16	18	21	23	25	24	22	20	—	20	18	30	9	12	42	—	7	11	..	..	1.0	..	..	..	..	..	5.0	3.0	—	9.0	граз. (15) граз. з гр. (20)
Васілевічы	16	18	16	18	20	22	24	23	20	20	—	20	18	28	8	11	40	47	8	12	..	4.0	..	..	..	..	..	..	2.0	0.2	—	6.2	—
Комарыно	17	19	17	17	20	22	24	22	21	19	—	20	18	30	9	12	45	—	—	—	..	1.0	..	..	0.1	..	..	..	0.1	3.0	—	4.2	—

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 11—20 чэрвеня 1935 г.

Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхавага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
Дрыса	S	4	SW	9	—	5	5	вільготны
Полацк	N	4	N	9	—	5	5	вільготны
Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
Нова-Каралёва	E	4	W	6	—	6	5	вільготны
Лепель	S	4	NW	9	—	5	3	вільготны
Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
Барысаў	NW	2	S	14	—	5	3	вільготны
Менск	NW	4	S	9	—	5	3	—
Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
Мар'іна-Горка	—	—	—	—	—	—	—	—
Асіпавічы	SE	6	S	12	—	5	3	вільготны
Орша	NW	4	NW	9	—	8	3	—
Горкі	NW	4	NW	9	59	5	3	вільготны
Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
Слуцк	NW	4	S	12	—	5	5	вільготны
Мар'іна-Сосны	W	1	W	6	—	5	3	вільготны
Магілеў	NW	2	NW	4	—	5	5	мокры
Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
Чэрыкаў	S	4	NW	9	—	5	3	вільготны
Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
Турск	—	—	—	—	—	5	—	—
Жлобін	SE	4	NW	9	—	5	3	мокры
Жыткавічы	SE	2	SE	6	—	5	3	—
Калінкавічы	NW	4	W	6	—	5	3	вільготны
Лельчыцы	W	2	W	4	—	5	5	сухі
Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	вільготны
Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
Гомель	SW	4	N	14	—	3	3	вільготны
Васілевічы	O	2	NW	6	68	5	3	вільготны
Камарына	SE	2	N	6	—	5	3	вільготны

Метэаралагічная характарыстыка за 11—20 чэрвеня 1935 г.

У агульным надвор'е ў гэтай дэкадзе было павышана цёплым у паасобныя дні яно змянялася вельмі значна. Ў першы дзень сярэдняя сутачная тэмпература вагалася ад 12 да 17°, у другі дзень яна значна павысілася ў заходняй частцы (на поўдзень ад Слуцка), а на 3-ці дзень зноў панізілася. Пасля пачалося значнае павышэнне т-ры і амаль да канца дэкады назіраліся вельмі высокія сярэднія сутачныя т-ры, у большасці ад 20 да 25°. Толькі ў паўночнай палове 19-га назіралася некаторае пахаладанне. Сярэдняя дэкадная т-ра вагалася ад 18 да 20°, максімальная ад 27 да 32°, а мінімальная ад 3 да 9°.

Ападкі выпалі надзвычайна ў разнастайных колькасцях. Дэкадныя сумы ападкаў вагаліся ад 4 да 64 мм. Можна вылучыць раён з малымі ападкамі абмежаваны лініяй Магілеў-Жыткавічы. У гэтым раёне выпала ад 4 да 20 мм. ападкаў, самыя малыя колькасці выпалі ў Камарыне (4 мм.) і Васілевічах (6 мм.) На астатняй тэрыторыі БССР ападкаў у большасці выпала больш 20 мм. Асабліва многа іх назіралася ў Слуцку (64 мм.) і Полацку (54 мм.) Выпадалі ападкі ў наступныя дні 12-га па ўсёй БССР невялікія дажджы, 16-га месцамі значныя ліўні, даўшыя 20—35 мм., у наступныя дні пераважалі невялікія дажджы і, нарэшце, 20-га у многіх месцах былі значныя дажджы з навальніцамі. Наогул навальніцы у вялікай колькасці адбыліся пераважна 18-га і 20-га. Воблачнасць была пераважна невялікая ў сярэднім 50% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская

Агрометаналіз за 11—20 чэрвеня

Становішча надвор'я справаздачнай дэкады, калі разглядаць яго з боку асноўных метэаралагічных элементаў—тэмпературы і ападкаў—досыць здавальняючае. Сярэдняя дэкадная т-р па ўсёй БССР амаль на 2-3° вышэй нормы. Ападкі выпадаўшыя за гэтую дэкаду у асоўным аказалі спрыяючы ўплыў на гаспадарчыя культуры, толькі мясцамі на тэрыторыі рэспублікі выпаў град (19 і 20-га чэрвеня), які нанёс шмат пашкоджанняў. Глеба досыць вільготная. Дзякуючы выпаўшым ападкам, збожжа значна палепшылася. У другую пяцідзёнку дэкады ападкаў выпала найвялікшая колькасць, на поўдні ападкаў выпала менш. Становішча збожжа наступнае:

Азімае жыта ў фазе масавага цвіцення, а ў асобных паўднёвых раёнах рэспублікі падыходзіць да малочнай спеласці. Вышыня росту 120—150 см. Ацэнка стану пераважна добрая, шмат раёнаў адзначаюць вельмі добрая.

Азімая пшаніца—знаходзіцца ў фазе масавага калашэння, на поўначы частка раёнаў паказвае выхад у трубку, асобныя паўднёвыя раёны адзначаюць цвіценне: вышыня росту 75—100 см., ацэнка стану пераважна сярэдняя, толькі метстанцыя Слуцка адзначае ніжэй сярэдняга.

Яравая пшаніца—у фазе выхаду ў трубку і калашэння, асобныя паўднёвыя метстанцыі адзначаюць цвіценне. Вышыня росту 40—60 см., ацэнка стану сярэдняя.

Авёс—пераважна ў фазе выхаду ў трубку, асобнымі метстанцыямі адзначаецца выметыванне, вышыня росту 40—53, ацэнка стану сярэдняя і вышэй сярэдняга, толькі метстанцыя Слуцк адзначае ніжэй сярэдняга.

Ячмень—знаходзіцца пераважна ў фазе выхаду ў трубку, на поўдні ў фазе калашэння, вышыня росту 40—60 см., ацэнка стану вышэй сярэдняга і сярэдняя.

Лён—знаходзіцца пераважна ў фазе цвіцення, асобныя раёны паказваюць яшчэ ўтварэнне суквеццяў, вышыня росту 40—60 см., ацэнка стану сярэдняя і вышэй сярэдняга.

Бульба месцамі знаходзіцца ў фазе ўтварэння сумеццяў, вышыня росту вагаецца каля 30 см. ацэнка стану сярэдняя і вышэй сярэдняга.

З гаспадарчых работ за гэтую дэкаду праводзілася баранаванне і акучванне бульбы; возка гною, узмёт пара, полка палявых культур і гародаў.

З феналагічных з'яў за другую дэкаду можна адзначыць:

Красаванне акацыі, зацвітанне жасміна, цвіценне васілька, выспяванне землянікі і чарнікі, цвіценне чырвонай канюшыны зацвітанне гваздзікі, калакольчыка, цвіценне лугавых траў, першае раенне пчол.

839

Адказны рэдактар—

Друк. БелАН Зак. № 734. Уп. Галоўліта № 291. Тыраж